Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 СНЕЖНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 237 (28095) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што стане з прадпрымальнікамі ў новым годзе?**

СТАР. 4

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Грошы для навукі на дарозе не валяюцца**




**ЕАЭС: вынікі першага года працы**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$4 млрд 584 млн**

*склалі золатавалютныя рэзервы краіны на 1 снежня. Па выніках лістапада ЗВР Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду скараціліся на $82,7 млн. На зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў аказалі ўплыў значнае памяншэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў, а таксама пагашэнне ўрадам і Нацбанкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме, паведамілі ў Нацыянальным банку.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18175,00 | ▲ |
| Еўра | 19693,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 265,22 | ▼ |
| Укр. грыўня | 771,76 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МІХАЙЛАЎСКІЯ ЧЫТАННІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гаспадыня бібліятэкі аграгарадка Міхайлаўка Светлагорскага раёна Алена ЛОБАЗЕВА *(на фота злева)* сустракае сваіх аднавяскоўак Вольгу ГАРДЗІЕНКУ і Ніну ДАШКОЎСКУЮ, якія з'яўляюцца даўнімі сябрамі гэтай установы культуры і заўсёды цікавяцца новымі кніжнымі паступленнямі.

■ Фінансавы выдатнік

## У БАНК, ЯК НА ПРАЦУ?

Цяпер доля актыўных карыстальнікаў банкаўскіх паслуг павялічылася да 44%, аднак і сёння каля мільёна беларусаў фінансавымі прадуктамі ўвогуле не цікавяцца



**Пра гэта на прэзентацыі вынікаў даследавання аб даступнасці фінансаў для нашых грамадзян паведаміў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей КАЛЕЧЫЦ. І вынікі аказаліся станоўчымі. Так, агульны індэкс фінансавай даступнасці для грамадзян Беларусі ў 2015 годзе склаў 90,3% пры тым, што летась гэты паказчык быў роўны 85,8%.**

### Карыстальнікі актывізуюцца

Спецыяліст адзначыў, што доля суайчыннікаў, якія наогул не выкарыстоўваюць фінансавых паслуг, за апошнія тры гады скарацілася. Нагадаю, што даследаванне па ацэнцы і аналізу доступу насельніцтва да фінансаў праводзіцца ў Беларусі другі раз (першае было ў 2012 годзе). Намеснік кіраўніка Нацбанка адзначыў, што, паводле вынікаў апытання, наогул не выкарыстоўваюць фінансавых паслуг 9,7% грамадзян, тады як у 2012-м гэты паказчык складаў 14,2%. Акрамя таго, сёлета істотна скарацілася колькасць карыстальнікаў базавага ўзроўню (з 38,6% у 2012-м да 22,6%), якія выкарыстоўваюць адну-дзве фінансавыя паслугі, што часта носяць абавязковы характар. Адначасова з гэтым павялічыліся долі актыўных і «прасунутых» карыстальнікаў, агульны аб'ём якіх склаў больш за 60% (43,8% і 19,5% адпаведна).

СТАР. 4

■ Надвор'е

## СОНЕЧНА НЕ ПА СЕЗОНЕ

**Спецыялісты абяцаюць сярэднюю тэмпературу паветра, на 3-5 градусаў вышэйшую за норму**



**Сапраўды анамальна цёплае надвор'е чакаецца ў Беларусі на гэтым тыдні. У пачатку яго тэмпература паветра ў параўнанні з мінулымі выхаднымі трохі панізіцца, але ўсё роўна будзе істотна вышэйшай за норму, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Пачынаючы з аўторка і да выхадных у нашай краіне будзе гаспадарыць паўднёвы антыцыклон. Вецер пачне сціхаць, а з ім і ападкі, якія прагназуюцца месцамі толькі ў чацвер. У асобных раёнах месцамі магчымы туманы, уначы і раніцай чакаецца слабы галалёд.

У сераду ўначы падмарозіць ад нуля да мінус 5 градусаў, а ўдзень будзе зноў плюс 1-7 градусаў. Тэмпература паветра ўначы на чацвер нават крыху павялічыцца, будзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Аднак удзень паветра прагрэецца толькі ад нуля да плюс 6 градусаў. У пятніцу на працягу сутак тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 6 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у будучыя выхадныя надвор'е пагоршыцца, бо праз нашу краіну пройдуць атмасферныя франты з Заходняй Еўропы. Часам чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі магчымы слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. Удзень стане ўвогуле некамфортна, прагназуецца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
*Да чытача з любоўю!*

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.